Яўгенія Пфляўмбаўм, жонка пісьменніка Максіма Лужаніна, разгадку ўзаемных цёплых і шчырых адносін Якуба Коласа з жанчынамі бачыла ў наступным, пра што ў 1955 годзе напісала яму: «Наогул, я пераканалася, дарагі дзядзька Якуб, што многія жанчыны хінуцца да Вас душою. Гэта, відаць, таму, што Вы з асаблівай цеплынёю ставіцеся да іх, што Вы як паэт умееце бачыць у іх тое ўнутранае, часта прыхаванае харaство, той “кристалл”, аб якім Горкі пісаў, што ён “кристаллизируется только на основе кристалла”».

Рэцэпцыя як адна з формаў культурна-літаратурнага ўзаемадзеяння выяўляе характэрныя асаблівасці функцыянавання пэўнай літаратуры, уключанасць таго ці іншага аўтара і яго твораў у літаратурны кантэкст. У такім аспекце несумненную цікавасць мае не толькі асоба Якуба Коласа, але і яго творчасць. Аксіялагічную важкасць творчай спадчыны народнага паэта маюць і ўпершыню апублікаваныя ў поўным аб’ёме лісты да Святланы Сомавай. В. Рагойша забяспечыў пашпартызацыяй тыя з іх, якія не дайшлі да адрасата, рупячыся пра будучых даследчыкаў эпісталярнай спадчыны пісьменніка.

## Бібліяграфічны спіс


1. Літаратуразнаўцы БДУ пра Якуба Коласа / падрыхт. А. І. Бельскі, У. Ю. Верына // Народныя паэты і пісьменнікі Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://narbel.bsu.by › litaratur... – Дата доступу: 22.09.2022.
2. Літаратуразнаўцы БДУ пра Янку Купалу / падрыхт. А. І. Бельскі, Г. М. Мятліцкая // Народныя паэты і пісьменнікі Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://narbel.bsu.by › litaratur... – Дата доступу: 22.09.2022.
3. Рагойша, В. Мой Трыглаў: кніга пра Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча / В. Рагойша. – Мінск: Кнігазбор, 2012. – 340 с.



*УДК 821.161.3.09(092)Колас+091.5(476)*


# ІНСКРЫПТЫ ЯКУБА КОЛАСА НА КНІГАХ, АДРАСАВАНЫЯ БЕЛАРУСКІМ ВУЧОНЫМ


**В. В. Міцкевіч**

*Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*f_vasilina@mail.ru*



У артыкуле пададзена інфармацыя аб дарчых надпісах Якуба Коласа на кнігах, якія пісьменнік падарыў вядомым беларускім вучоным, змешчаны інскрыпты паэта, якія раней не былі вядомы даследчыкам спадчыны класіка беларускай літаратуры.



*Ключавыя словы:* Якуб Колас; інскрыпты; беларускія вучоныя; адкрыцці.


# YAKUB KOLAS’ INSCRIPTS ON BOOKS, ADDRESSED TO BELARUSIAN SCIENTISTS


**V. V. Mitskevich**

*Yakub Kolas State Literary and Memorial Museum*
*Minsk, Republic of Belarus*
*f_vasilina@mail.ru*



The article represents information about Yakub Kolas’ inscriptions on the books that the writer presented to famous Belarusian scientists, the poet’s inscriptions, which were not previously known to researchers of the heritage of the classic of Belarusian literature are revealed.



*Key words:* Yakub Kolas; inscriptions; Belarusian scientists; discoveries.

Якуб Колас зрабіў важкі ўнёсак не толькі ў развіццё беларускай літаратуры, але і навукі. З 1929 г. і да канца свайго жыцця паэт – нязменны віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук Беларусі. У акружэнне пісьменніка ўваходзіла шмат дзеячаў беларускай навукі, многім з іх паэт дарыў свае кнігі з подпісамі.

1. *Бузук Пётр Апанасавіч* (1891–1938) – беларускі мовазнавец-славіст, педагог. Скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Адэскага ўніверсітэта. З 1916 г. – выкладчык рускай мовы ва ўніверсітэце. Доктар філалагічных навук (1924), прафесар (1925). Восенню 1925 г. па запрашэнні рэктара БДУ У. І. Пічэты пераехаў у Мінск, чытаў лекцыі. У 1926–1930 гг. працуе ў Інстытуце беларускай культуры, загадчык дыялекталагічнай камісіі. З 1931 г. – дырэктар Інстытута мовазнаўства АН БССР; загадчык кафедры мовазнаўства Мінскага педагагічнага інстытута. Аўтар прац па дыялекталогіі і лінгвістычнай геаграфіі Беларусі. Пад псеўданімам П. Росіч друкаваў вершы, апавяданні, пераклады ў «Маладняку», «Полымі», газетах. Пры аналізе моўных сродкаў у творах Якуба Коласа, Міхася Чарота, Цішкі Гартнага і іншых П. А. Бузук паказаў ролю і значэнне дыялектных слоў і форм, якія ўзбагачаюць літаратурную мову. Аўтар артыкула «Мова і правапіс твораў Якуба Коласа», які ўвайшоў у кнігу «Якуб Колас у літаратурнай крытыцы», выдадзеную да дваццацігоддзя літаратурнай дзейнасці паэта. Быў беспадстаўна арыштаваны 10 лютага 1934 г., сасланы на 3 гады ў Волагду, дзе працаваў у педагагічным інстытуце. Пасля заканчэння ссылкі ў 1937 г. зноў арыштаваны 7 снежня 1937 г. Расстраляны 7 лютага 1938 г. У 1988 г. рэабілітаваны. Знаёмы з Якубам Коласам па Інстытуце беларускай культуры АН БССР.

Якуб Колас падарыў П. Бузуку кнігу «Сымон-музыка» (1925 г.), на тытульнай старонцы асобніка паэт напісаў: «**Шаноўнаму профэсару Пятру Афанасавічу Бузуку. Якуб Колас. 24.XI.1925 г. г. Менск**». П. Бузук у артыкуле «Мова і правапіс твораў Якуба Коласа» адзначаў: «Асабліва сакавітай з’яўляецца мова “Новай зямлі” і “Сымона музыкі” <…> З боку стылістычнага мова нашага паэта з’яўляецца вельмі мастацкай; у ёй знаходзім шмат метафар і метанімій» [1, с. 136].

2. *Дзяржынскі (Чаржынскі) Уладзіслаў Вікенцьевіч* (1897–1974) – беларускі крытык, літаратуразнавец, сябра Якуба Коласа з часоў Інбелкульта. Вучыўся ў Гродзенскай гімназіі, пасля яе эвакуацыі перавёўся ў Мінскую гімназію, якую скончыў у 1918 г. У 1918–1919 гг. даваў прыватныя ўрокі ў мястэчках Крайск і Пасадзец на Лагойшчыне. У 1925 г. скончыў этнолага-лінгвістычнае аддзяленне БДУ. Вучобу сумяшчаў з выкладчыцкай дзейнасцю на рабфаку (1922–1924 гг.) і працай у Інстытуце беларускай культуры. Працаваў у АН БССР. З 1922 г. пачаў выступаць з крытычнымі і літаратуразнаўчымі артыкуламі ў беларускім друку, у якіх ён імкнуўся даць грунтоўны аналіз як асобных мастацкіх твораў, так і літаратурнага працэсу ў цэлым. Яго даследаванні і сёння ўражваюць глыбінёй навуковай думкі, аргументаванасцю. Па творчасці Якуба Коласа У. В. Чаржынскі напісаў шэраг артыкулаў. У 1925 г. У. В. Чаржынскі – супрацоўнік часопіса «Полымя». Арыштаваны ДПУ БССР 28 чэрвеня 1930 г. па справе «Саюза вызвалення Беларусі». Высланы ў Казань тэрмінам на 5 гадоў. Застаўся жыць у Казані, працаваў там выкладчыкам у розных ВНУ. Пасля арышту і высылкі адышоў ад літаратурнай дзейнасці. У 1940–50-х гг. перапісваўся з Якубам Коласам. Рэабілітаваны 10 чэрвеня 1988 г. У музей Якуба Коласа У. В. Чаржынскі перадаў шмат рукапісаў, фотаздымкаў, прыжыццёвых выданняў твораў Якуба Коласа, у тым ліку з аўтографамі аўтара. Зборнік апавяданняў «У ціхай вадзе», які выйшаў у Менску ў 1925 годзе, утрымлівае наступны дарчы надпіс паэта: «**Выдатнейшаму беларускаму літаратурнаму крытыку У. Чаржынскаму ад аўтара. Менск. 30.III.1925 г.**». На першым томе збору твораў Якуб Колас напісаў: **«У. Чаржынскаму на памяць ад Якуба Коласа. 30.X.1928 г.»**. Яшчэ адзін інскрыпт аўтара захаваўся на кнізе «Рыбакова хата» (1947 г.): **«Дарагому Ўладыславу Вікенцывічу Чаржынскаму. Якуб Колас. 28.II.1948 г.».**

3. *Шчарбакоў Васіль Карпавіч* (1898–1938) – беларускі гісторык, акадэмік АН Беларусі (1931), доктар гістарычных навук (1934). Нарадзіўся 27 лютага 1898 г. у в. Дуброўка Аршанскага раёна ў сялянскай сям’і. Скончыў Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю ў 1918 г., у 1923 г. – Харкаўскую вышэйшую партыйную школу. З 1923 г. – на партыйнай, педагагічнай і

навуковай працы. У 1931–1937 гг. – на розных пасадах у АН БССР. Працаваў у Мінскім педінстытуце, БДУ. У 1937 г. беспадстаўна арыштаваны, у 1938 г. – расстраляны. Рэабілітаваны 25 ліпеня 1957 г.

Кніга «Новая зямля» (1934 г.), на якой рукою Якуба Коласа напісана «**Дарагому Васілю Карпавічу Шчарбакову. У вольныя часіны прачытайце. Я. Колас 14.VI.1934 г.**», была падаравана тагачаснаму віцэ-прэзідэнту АН БССР, з якім Якуб Колас быў у сяброўстве. Сын В. К. Шчарбакова сябраваў з малодшым сынам Якуба Коласа Міхасём Канстанцінавічам Міцкевічам. Па сведчанні старэйшага сына Якуба Коласа Данілы Канстанцінавіча, В. К. Шчарбакоў быў першым чалавекам, які расказаў Якубу Коласу пра В. І. Талаша. Пра яго жыццё Шчарбакоў даведаўся, калі пабываў на Палессі ў 1932 годзе. У выніку нарадзілася аповесць Якуба Коласа «Дрыгва».

Кніга «Новая зямля» з інскрыптам аўтара была перададзена ў музей у 1960-х гг. Знойдзена яна была ў Германіі ў 1945 г. у адной з прыватных бібліятэк у прадмесці Берліна. Вайсковец, які выбіраў кнігі для сябе, выявіў яе там, а пазней перадаў дырэктару музея Д. К. Міцкевічу.

4. *Шэмпель Віктар Іванавіч* (1908–1975) – беларускі аграхімік, акадэмік Акадэміі навук БССР (1950), заслужаны дзеяч навукі БССР (1968). Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1929). У 1942–1946 гг. навуковы сакратар Прэзідыума АН БССР, дзе працаваў разам з Якубам Коласам. Падчас эвакуацыі жыў у Ташкенце ў адным доме з сям'ёй Якуба Коласа. У Ташкенце і быў падараваны зборнік вершаў «Голос земли» з дарчым надпісам ад аўтара на тытульнай старонцы выдання: «**Дарагому Віктару Іванавічу Шэмпелю. Якуб Колас. 6.I.1943 г.**». З 1946 г. В. І. Шэмпель – дырэктар Інстытута сацыялістычнай сельскай гаспадаркі АН БССР, з 1949 г. рэктар Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. У 1957–1961 гг. акадэмік-сакратар аддзялення земляробства, меліярацыі і раслінаводства Акадэміі сельскагаспадарчых навук БССР.

5. *Ус Антон Антонавіч* (1894–1980) – мастацтвазнавец і літаратуразнавец, выкладчык. Нарадзіўся ў в. Мішуковічы былой Віленскай губерні, цяпер Іўеўскі раён Гродзенскай вобласці. Рана застаўся без бацькоў, зведаў горкую долю пастушка і батрака. Удзельнік Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. У 1919 г. уступіў у РКП(б). З 1920 г. – загадчык сакрэтна-шыфравальнага аддзела Цюменскага губваенкамата. У 1924 г. працаваў у Омскім губкаме ВКП(б), адначасова вучыўся на рабфаку. У 1929 г. скончыў Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт, у 1932 г. – аспірантуру Інстытута чырвонай прафесуры. Выкладаў у Маскоўскім універсітэце. У 1932–1934 гг. загадчык сектара мастацтва і літаратуры ЦК КП(б)Б. У 1935–1936 гг. працаваў дырэктарам Інстытута выяўленчых мастацтваў пры Акадэміі мастацтвазнаўства ў Ленінградзе, адначасова загадваў аддзелам мастацтва другой паловы XIX стагоддзя ў Дзяржаўным Рускім музеі. У 1935 г. А. А. Ус выключаны з ВКП(б). У 1936 г. асуджаны за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў пазбаўлення волі. Вызвалены ў 1940 г. Жыў і працаваў выкладчыкам літаратуры ў Молатаве (цяпер – Перм), там жа знаходзіўся падчас Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вызвалення Мінска працаваў выкладчыкам Мінскага педінстытута. У 1944–1948 гг. – старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры, мастацтва і мовы АН БССР. За публікацыі па гісторыі беларускага мастацтва і літаратуры абвінавачаны ў нацыяналізме, у красавіку 1948 г. звольнены з работы і пазбаўлены мінскай прапіскі. Працаваў выкладчыкам ВНУ ў Вільнюсе і на Урале. У 1952–1956 гг. выкладаў у Брэсцкім педінстытуце. Рэабілітаваны ў 1956 г.

Першымі творамі Якуба Коласа, якія прачытаў Антон Ус, былі верш «На рэчцы» і казка «Што яны страцілі». Пасля прачытання казкі Антон Ус адважваецца даслаць любімаму пісьменніку сваё апавяданне пра селяніна-бедняка, атрымлівае ў адказ ліст ад Коласа з папраўленым ягонаю рукой апавяданнем. Якуб Колас раіць пачаткоўцу шмат чытаць, назіраць за жыццём і, вядома, пісаць. Першая сустрэча адбылася ў 1927 г. у Маскве на Арбацкай вуліцы, у Беларускім зямляцтве, дзе праходзіў вечар, прысвечаны творчасці Якуба Коласа. У пачатку 1930-х гг. Антон Ус часта наведвае дом Якуба Коласа ў Вайсковым завулку. Летам 1933 г. Ус і Колас разам адпачываюць на лецішчы ў в. Цербуты недалёка ад Менска. Якуб Колас наведвае Антона Уса ў 1935 г. у Ленінградзе. Антон Ус і Якуб Колас перапісваюцца ў 1940–1950-х гг.

У 1952 г. Антон Антонавіч выступае ў Брэсцкім педінстытуце з дакладам «Вобразы Якуба Коласа ў выяўленчым мастацтве». Апошняя сустрэча Якуба Коласа і Антона Уса адбылася ў сакавіку 1956 г. у бальніцы, дзе пісьменнік знаходзіўся на лячэнні. Антон Ус – аўтар рэцэнзіі на паэму «Новая зямля» (друкавалася ў «Ленинградской правде»), адзін з першых напісаў рэцэнзію на паэмы Якуба Коласа «Адплата» і «Суд у лесе». Антон Ус быў шчаслівым уладальнікам чатырох кніг з інскрыптамі ад Якуба Коласа. На зборніку вершаў, які выйшаў у Мінску ў 1940 г., Якуб Колас напісаў: «**Антону Антонавічу Усу на памяць ад Якуба Коласа. Мінск 30.III.1941 г.**». На асобніку паэмы «Палтава» А. С. Пушкіна, якая выйшла ў Мінску ў 1938 г. у перакладзе Якуба Коласа на беларускую мову, пісьменнік пакінуў наступны дарчы надпіс: «**Дарагому, міламу Антону Антонавічу Усу на памяць ад перакладчыка. Якуб Колас. Мінск. 16.IV.1941 г.**». Асобнік паэмы Якуба Коласа «Суд у лесе» захаваў наступны інскрыпт аўтара: **«Дарагому другу Антону Антоновічу Уссу на памяць. Якуб Колас. 30 мая 1943 г.».** «**Дарагому другу-земляку на памяць аб пражытых часах – Антону Антонавічу Усу. Якуб Колас. 3.I.1944 г. Клязьма Маскоўскай вобласці**» – такі дарчы надпіс пакінуў паэт на зборніку вершаў «Голос земли» (1943 г.).

6. *Мацапура Міхаіл Яфрэмавіч* (1908–1971) – беларускі вучоны ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі, акадэмік Акадэміі навук БССР (1947), доктар тэхнічных навук (1945), прафесар (1947), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР (1954), знаёмы і сябра Якуба Коласа. Скончыў Ленінградскі інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі (1932). З 1933 г. старшы навуковы супрацоўнік, дырэктар Беларускай навукова-даследчай станцыі механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, з 1938 г. – загадчык лабараторыі Усесаюзнага НДІ механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. У 1947–1950 гг. акадэмік-сакратар АН БССР, адначасова ў 1947–1957 гг. дырэктар Інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі АН БССР. У 1957–1961 гг. на розных пасадах у Акадэміі сельскагаспадарчых навук БССР. Аўтар навуковых прац па стварэнні сельгасмашын і прыстасаванняў да іх, тэхналогіі і сістэм машын для асушэння балот, асваення забалочаных зямель, для нарыхтоўкі торфу і тарфяных угнаенняў, падрыхтоўкі кармоў для жывёлагадоўлі, уборкі бульбы і збожжавых культур ва ўмовах залішняй вільготнасці. Лаўрэат Ленінскай прэміі (1962), Дзяржаўных прэмій СССР (1951; 1952) па распрацоўцы комплексу машын для асваення забалочаных зямель.

М. Я. Мацапура ўспамінаў: **«Я полюбил Якуба Коласа за его гуманизм и патриотизм, за заботу о своём народе, за то, что он был истинным государственным деятелем, отдавшим все силы для блага народа. Он был для нас примером человечности, содержания жизни для счастья людей. Я полюбил творчество Якуба Коласа, живой и лёгкий язык поэта…»** [3, с. 9–10]. У дарунак ад класіка беларускі навуковец атрымаў кнігу выбраных твораў на рускай мове з наступным інскрыптам: «**Дарагому Міхаілу Ефрэмавічу Мацапура на памяць. Якуб Колас. 21.X.1949 г.**».

7. *Гарэцкі Гаўрыла Іванавіч (1900–1988)* – беларускі геолаг, географ, эканаміст, грамадскі дзеяч, заснавальнік савецкай школы палеанталогіі і беларускай школы даследчыкаў антрапагену. Акадэмік Акадэміі навук Беларусі (1928), доктар геолага-мінералагічных навук (1946). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1971), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1986). Брат беларускага пісьменніка Максіма Гарэцкага. Нарадзіўся ў вёсцы Малая Багацькаўка на Мсціслаўшчыне ў сялянскай сям'і. Скончыў Каморніцка-аграрнае вучылішча ў Горках, у 1920 г. стаў студэнтам Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі. У 1925–1928 гг. з'яўляецца правадзейным членам, а з 1927 г. членам Прэзідыума Інбелкульта. З верасня 1925 г. Гарэцкі дацэнт і загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках. У 1926 г. у Горкі пераехаў брат Максім, дзе ўзначаліў кафедру беларускай мовы і літаратуры ў акадэміі. З 1928 г. сем'і братоў Гарэцкіх жывуць у Мінску. Сябруюць з сем'ямі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Аркадзя Смоліча, Сцяпана Некрашэвіча, Язэпа Лёсіка і інш. У 1930 г. Гаўрылу Гарэцкага арыштавалі і асудзілі да вышэйшай меры пакарання (расстрэлу) з заменай гэтага пакарання зняволеннем у канцлагеры на 10 год. Праз некаторы час яго ўзялі на працу ў Геалагічны аддзел Беламорска-Балтыйскага камбіната ў пас. Мядзведжая

Гара, дзе ён авалодаў новай спецыяльнасцю – інжынернай геалогіяй. Паўторна арыштаваны ў 1937 г., праз тры месяцы вызвалены. У 1938 г. арыштаваны яшчэ раз, 8 мая 1938 г. асуджаны да расстрэлу. Больш за год прабыў у турме, цудам застаўся жывы. 22 чэрвеня 1939 г. Гарэцкі быў вызвалены з турмы ў сувязі са «спыненнем справы». Жыў у розных мясцінах Расіі, праводзіў інжынерна-геалагічныя даследаванні. З 1939 г. працуе геолагам у Салікамску, з 1940 г. – у Ленінградскім раёне, з 1941 г. – мабілізаваны на абаронныя работы, прызначаны галоўным геолагам ва Упраўленне ваенна-палявога будаўніцтва Галоўабаронбуда Наркамата абароны. У 1956 г. Гаўрылу Гарэцкага перавялі ў філіял Гідрапраекта СССР, які знаходзіўся ў горадзе Дзедаўску, прыблізна 40 км ад Масквы. За плячыма Г. Гарэцкага былі інжынерна-геалагічныя вышуканні многіх аб'ектаў, сярод якіх Беламорска-Балтыйскі канал, Ніжне-Туломская ГЭС, Кольскі канал, Верхне-Туломская ГЭС, Рыбінскі гідравузел ды інш. Рэабілітаваны 22 кастрычніка 1958 г., у 1965 г. адноўлены ў званні акадэміка. У 1969 г. Гаўрыла Гарэцкі здолеў вярнуцца ў Мінск. На Бацькаўшчыне апошнія дваццаць гадоў жыцця для Гаўрылы і яго жонкі Ларысы былі сапраўдным падарункам лёсу, іх самым шчаслівым часам, калі мары здзейсніліся.

На памяць ад класіка ў сям'і Ларысы і Гаўрылы Гарэцкіх захоўвалася некалькі кніг з інскрыптамі, у тым ліку і паэма «Рыбакова хата» (1947 г.). 25–27 снежня 1947 г. Якуб Колас пісаў Гарэцкім: «**Мае дарагія Ларыса і Гаўрыла! Пасылаю вам сваю паэму "Рыбакова хата". Прашу прабачэння за неахайны экзэмпляр. На ім шмат паметак, але ўсё ж чытаць можна. Вельмі прашу Г. І. напісаць мне падробна аб сваім сучасным становішчы. Я ўсё ж хачу вярнуць вас на Беларусь… Якуб Колас**» [2, с. 318]. Асобнік «Рыбаковай хаты» захаваў наступны дарчы надпіс аўтара: **«Маім мілым, дарагім землякам Ларысе і Гаўрыле Іванавічу Гарэцкім на добрую памяць. Якуб Колас 25.XII.1947 г.»**.

8. *Барычэўскі Яўген Іванавіч* (1883–1934) – беларускі літаратуразнавец. Вучыўся ў Берлінскім і Маскоўскім універсітэтах. З 1922 г. – выкладчык БДУ, з 1927 г. – навуковы супрацоўнік Інбелкульта, пасля – Інстытута літаратуры і мастацтва АН БССР. Даследаваў пытанні эстэтыкі, тэорыі літаратуры, літаратурных жанраў (манаграфіі «Паэтыка літаратурных жанраў», «Тэорыя санета», 1927); выступаў з літаратурна-крытычнымі артыкуламі пра творчасць А. С. Пушкіна, М. Багдановіча, Янкі Купалы. Знаёмы з Якубам Коласам па БДУ і Інбелкульту. Асобнік паэмы «Сымон-музыка» (1925 г.) з дарчым надпісам Барычэўскаму – «**Дорогому Евгению Ивановичу Боричевскому. Якуб Колас. 17.IX.1928 г.**» – захоўваецца ў фондах Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.

Дзякуючы праекту музея Песняра «Ад усяго сэрца, ад усёй душы: інскрыпты Якуба Коласа на кнігах», які атрымаў падтрымку фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, былі выяўлены інскрыпты Якуба Коласа на кнігах, якія былі невядомы даследчыкам спадчыны класіка беларускай літаратуры. Два з іх адрасаваны Я. І. Барычэўскаму. На першым выданні збору твораў (том 1, выпуск 1) аўтар напісаў: **«Аўгеню Іванавічу Барычэўскаму на памяць ад Якуба Коласа 3.X.1928 г.»,** на томе 1, выпуск 2 – **«Глыбокапаважанаму Аўгеню Іванавічу Барычэўскаму ад Якуба Коласа 31.X.1928 г.»**. Абедзве кнігі захоўваюцца ў Дзяржаўным музеі А. С. Пушкіна ў Маскве.

Кнігі з інскрыптамі Якуба Коласа, адрасаваныя беларускім вучоным, з'яўляюцца матэрыяльным сведчаннем таго, што ў акружэнне паэта ўваходзіла вялікая колькасць таленавітых людзей, у тым ліку і вядомых навукоўцаў.

### Бібліяграфічны спіс

1. Бузук, П. А. Мова і правапіс твораў Якуба Коласа / П. А. Бузук // Якуб Колас у літаратурнай крытыцы: зб. арт. да дваццацігоддзя літаратурнай дзейнасці / склад. У. Дзяржынскі. – Менск, 1926. – С. 132–138.

2. Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа. Калекцыя «Рукапісы». – КП 312.

3. Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Фонд рэдкіх кніг і рукапісаў. – Ф. 13. – Воп. 1. – Спр. 786.